Created in Master PDF Editor - Demo Version

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

Рэспубліканскі конкурс навуковых работ студэнтаў вышэйшых навучальных установаў Рэспублікі Беларусь

Філасофія, сацыялогія, гісторыя. Гісторыя Беларусі і праблемы ўзаемадзеяння цывілізацый

# Айчынная гістарыяграфія гісторыі гарадоў Беларусі ў эпоху феадалізму

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Врублеўскі Юрый
Уладзіміравіч
выпускнік
(магістр)

Навуковы кіраўнік:
доктар гістарычных навук,
прафесар, загадчык кафедры
гісторыі Беларусі
Люты А.М.

Мінск, 2009

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ……………………………………………………………3

ГЛАВА 1 ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АГЛЯД ПРАБЛЕМЫ І АГУЛЬНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ РАБОТЫ……………………………………………………………4

1.1 Айчынныя гістарыяграфічныя працы як аб’ект даследавання………………………………………………………4
1.2 Агульная канцэпцыя і метадалогія праведзенага даследавання………………………………………………………12

ГЛАВА 2 ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ГІСТОРЫІ ФЕАДАЛЬНЫХ ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ (КН. XI – XVIII СТСТ.)……………………17

2.1 Метадалагічныя праблемы дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі гарадоў Беларусі эпохі феадалізму………………………………………………..18
2.2 Гісторыя гарадоў Беларусі XVI – XVII стст. у працах беларускіх гісторыкаў 20-40 гг. XX ст.……………………………………………………………22
2.3. Гістарыяграфічны аналіз археалагічных прац айчынных даследчыкаў гісторыі гарадоў Беларусі XI – XVIII стст.……………………………………………………………24
2.3.2 Роля беларускіх гарадоў феадальнай эпохі ў станаўленні дзяржаўнасці: гістарыяграфічны аспект……………...………………………..32
2.4 Стан і праблемы даследавання феадальных гарадоў Беларусі ў айчыннай гістарычнай навуцы (60-80-ыя гг. XX ст.) …………...………...........................................................................35
2.5 Сучасныя гістарычныя даследаванні гісторыі гарадоў Беларусі феадальнай эпохі………………………………………………..38

ЗАКЛЮЧЭННЕ………………………………………………………42
БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС……………………………………………44

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

# УВОДЗІНЫ

Аналіз айчыннай гістарыяграфіі гісторыі беларускіх гарадоў у эпоху феадалізму дазваляе сцвярджаць, што да цяперашняга часу не было комплекснага даследавання праблемы. Гістарыяграфічныя працы, па сваёй сутнасці, канцэптуальна абмежаваныя, насілі, як правіла, апісальны характар і разглядаліся ў межах пэўнай праблемы.

Актуальнасць вывучэння тэмы даследавання і яе напісання, па-першае, абумоўлена неабходнасцю крытычнага пераасэнсавання ўяўленняў, якія былі раней ўсталяваны ў гістарычнай навуцы адносна вывучэння гісторыі феадальных гарадоў Беларусі, што неабходна для ўдакладнення і вырашэння новых даследчых накірункаў.

Па-другое, актуальнасць работы абумоўлена недастатковай ступенню аналізу і абагульнення цэльнай сукупнасці матэрыялу па гісторыі феадальных гарадоў Беларусі, у сістэмным і комплексным выглядзе, канцэптуальна выверанымі метадалагічна абгрунтаваным.

Даследаванне па айчыннай гістарыяграфіі гісторыі гарадоў Беларусі ў эпоху феадалізму мае значнасць вынікаў для гістарычных дысцыплін, разуменнем сутнасных працэсаў, якія характарызуюць грамадскі лад феадальнага і буржуазнага грамадства. Навуковыя вынікі работы могуць быць карысны для гуманітарных дысцыплін трывалай тэарэтычнай базай, узважанай магчымасцю рэалізацыі канцэптуальных падыходаў і асабістай канцэпцыі дысертанта.

У сістэме айчынных гістарыяграфічных прац, тэма навуковай работы займае месца грунтоўнага праблемнага даследавання. Па сваім тэарэтычным узроўні, работа прысвечаная аналізу вывучанасці праблемы цэлай гістарычнай эпохі, выступае як адна з першых у айчыннай гістарычнай навуцы. Навуковая работа, канкрэтызаваная праблемамі гарадоў Беларусі феадальнай эпохі, дае падставы для вызначэння заканамернасці гістарычнага развіцця і служыць складовай часткай болей шырокіх даследчых накірункаў, сувязі якіх ўзаемаабумоўлены.

Зыходзячы з актуальнасці даследавання, ступені яго навуковай распрацаванасці мэтай навуковай работы з'яўляецца выяўленне тэарэтыка-метадалагічных асноў айчыннай гістарыяграфіі гісторыі гарадоў Беларусі ў эпоху феадалізму.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашэнне наступных даследчых задач:

- ✓ выявіць праблемна-змястоўныя прыярытэты ў айчынных даследаваннях па гісторыі феадальных гарадоў Беларусі;
- ✓ разгледзіць асноўныя канцэптуальныя падыходы айчынных гісторыкаў да вывучаемай праблемы;
- ✓ прааналізаваць метадалогію і тэарэтычны ўзровень прац айчынных даследчыкаў, прысвечаных праблемам феадальных гарадоў Беларусі;

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

- ✓ вызначыць накірункі даследавання гісторыі гарадоў Беларусі перыяду феадалізму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі работы:**

Праблемна-змястоўныя прыярытэты гісторыкаў клерыкальна-дваранскай гістарыяграфіі на прамую залежалі ад навуковых інтарэсаў, прысвечаных царкоўна-рэлігійным і дзяржаўна-палітычным пытанням айчыннай гісторыі. Гарады Беларусі не сталі самастойным прадметам гістарычнага даследавання і разглядаліся ў рамках пэўнай праблемы. Пашырэнне праблем, разглядаемых у межах дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі адбылося часткова за конт уключэння ў даследчую сферу дзяржаўна-прававых інтарэсаў і тым самым пытанняў гарадской арганізацыі і, дзякуючы метадалагічнаму ўдасканаленню прац, праз выхад да новых накірункаў – эканамічную гісторыю горада. Падобную тэндэнцыю можна разглядаць і пры аналізе савецкай гістарыяграфіі. У цэнтры ўвагі савецкіх гісторыкаў – праблемы сацыяльна-эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця гарадоў, матэрыяльная культура. На сучасным этапе намаганні даследчыкаў напраўлены, па-першае на вывучэнне пытанняў, якія вызываюць навуковы інтарэс у розных дысцыплін і могуць разглядацца з пункту гледжання міждысцыплінарнасці. Пры разглядзе канкрэтна-гістарычнага зместу гістарыяграфічных прац магчыма заўважыць, што даследаванні ў асноўнымі мелі апісальны характар.

Храналагічна-праблемны падыход пры разглядзе гісторыі гарадоў Беларусі, які стаў стандартнай навуковай аперацыяй даследчыкаў у вызначэнні храналагічна-прасторавых межаў і, быў дамінуючым доўгія часы, не дазволіў разглядзець станаўленне і развіццё беларускага горада феадальнай эпохі як сутнасную з’яву адзінага працэсу, сувязі якога ўзаемадэтэрмінаваны і існуюць незалежна ад пазнання гісторыка. На падставе падыходу, заснаванага на прынцыпе аналагічнасці і паралелізму айчыннымі савецкімі гісторыкамі даследавалася гісторыя гарадоў. Высновы гісторыкаў адносна падзей і з’яў агульнай гісторыі краіны экстрапаляваліся на макрагісторыю (гісторыю гарадоў), калі падкрэслівалася падабенства працэсаў. Характэрнай тэндэнцыяй савецкай гістарычнай навукі, стала пашырэнне межаў прадмета разглядаемых гістарычных даследаванняў, шляхам надання феадальнаму гораду элементаў капіталістычных адносін, што не заўсёды падводзіла даследчыкаў да аб’ектыўнага разумення гістарычнай рэчаіснасці [1, 2]. У апошнія часы набывае арыгінальнасць дынамічна-экзістэнцыяльна-анрапалагічны падыход, згодна з якім неабходна вывучаць мінулае ў яго ўзаемасувязі з сучасным і пры вызначэнні сувязей мэтазгодна паказаць усе станоўчыя і адмоўныя фактары, гісторыя павінна станавіцца зразумелай блізкай.

У развіцці тэарэтыка-метадалагічных асноў айчыннай гістарыяграфіі гісторыі феадальных гарадоў Беларусі можна вылучыць наступныя этапы: 1) **суб’ектыўна-ідэалітсычная** метадалогія як сістэма навукова-пазнавальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

працэдур і спосабаў пазнання гістарычнай рэчаіснасці дарэвалюцыйнымі гісторыкамі, якія грунтуюцца на суб’ектыўных ацэнках і ідэалістычных законах (аўтарскае вызначэнне). Выкарыстанне суб’ектыўнага метаду, пошук законаў – характэрныя рысы пазітывісцкай гістарыяграфіі (другая палова XIX – пачатак XX ст.). Зыходнай тэарэтычнай пазіцыяй гісторыкаў стала наданне вырашаючай ролі заканадаўству, як галоўнай сілы, якая ўздзейнічае на змяненне грамадскага ў тым ліку і гарадскога ладу. 2) 2 этап – **марксісцка-ленінская метадалогія** (пачатак XX ст. – 80-я гг. XX ст.) не атрымаўшая свайго развіцця, якая з аднаго боку ўнесла ўклад у распрацоўку тэорыі фактарнасці, тым самым засяродзіўшы ўвагу на распрацоўцы сацыяльна-эканамічнай гісторыі, з другога боку пад уздзеяннем ідэалагічнага пераакрэслення, мела праявы канцэптуальнай абмежаванасці. Распрацоўка тэарэтычнай базы беларускімі савецкімі гісторыкамі не дасягнула належнага ўзроўню ў сувязі з метадалагічнымі абмежаванасцямі і панаваннем адзінай ідэалогіі. Фактычны матэрыял і шырокія абагульненні ў працах беларускіх савецкіх гісторыкаў не заўсёды аб’ектыўна адлюстроўвалі гістарычную рэчаіснасць. Праявы метадалагічнай абмежаванасці адчувальны і пры даследаванні археалагічных прац, што пацвярджаецца адсутнасцю у іх тэарэтычных высноў і абагульненняў, факталагізмам, узведзеным савецкімі археолагамі у ранг дакладнасці пры канстатацыі гісторыі матэрыяльнай культуры гарадоў, што ў сваю чаргу запавольвала зварот да ацэначных суджэнняў. Апошняя фармулёўка дазваляе ўнесці новы тэарэтычны тэзіс: Разглядаючы перыяд пачатку XX – 80-х гг. XX ст. можна казаць аб адначасовым суіснаванні **пазітывісцкай** і **марксісцка-ленінскай** метадалогіі ў айчыннай гістарыяграфіі, што ўносіць сабой новае разуменне тэарэтыка-метадалгічных праблем гістарыяграфічных даследаванняў. 3) метадалагічны крызіс 90-х гг. XX ст. абумовіўшы наяўнасць плюралізму думак, франтальны перагляд канцэпцый, паўплываў на **станаўленне сінкрэтычнай метадалогіі** (90-я гг. XX ст. пачатку XXI ст.). Значная ўвага сучаснымі даследчыкамі надаецца распрацоўцы тэорыі урбанізацыйных працэсаў.

Аналіз айчыннай гістарыяграфіі вывучаемай праблемы дазваляе вызначыць навуковыя праблемы, якія патрабуюць ўдакладнення і далейшага вывучэння: паказаць асноўныя напрамкі культурнага развіцця асобных гарадоў Беларусі на працягу феадальнай эпохі (светапоглядныя ўяўленні гараджан, сістэма навучальных устаноў, узровень пісьменнасці, побытавыя аспекты жыццядзейнасці, культурныя дасягненні этнічных меншасцей); прааналізаваць сацыяльна-дэмаграфічныя працэсы ў феадальных гарадах; вызначыць ролю гарадоў Беларусі ў фарміраванні буржуазнага класа; паказаць іх ролю ў станаўленні дзяржаўнасці [3], выявіць шматгранныя сувязі паміж горадам і вёскай і інш. Зазначым, што рэалізацыю новых задач магчыма ажыцявіць на падставе спалучэння метадалагічных падыходаў у працэсе напісання гістарычнага даследавання.

**Рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню атрыманых вынікаў:**

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

- Вынікі праведзенага навуковага даследавання ствараюць аснову для далейшага вывучэння праблемы гісторыі феадальных гарадоў Беларусі паколькі вызначаюць новыя накірункі даследавання гарадоў;
- Фактычны матэрыял і высновы навуковай работы могуць быць выкарыстаны пры напісанні навуковых прац, манаграфій, падручнікаў па айчыннай гісторыі, пры распрацоўцы спецкурсаў, спецсемінараў, лекцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version